**ГОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ**

# Свята Слова і Кнігі

**У сталічнай кнігарні «Светач» адбылася імпрэза «Кніжны свет Беларусі: Берасцейшчына», у якой прынялі ўдзел знакамітыя пісьменнікі, навукоўцы, журналісты, выдаўцы, чый лёс звязаны з Берасцейшчынай, а таксама прадстаўнікі брэсцкіх абласной і гарадской уладаў.**



Арганізатарамі мерапрыемства выступілі ААТ «Белкніга», выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Сённяшняе свята Слова і Кнігі – гэта вынік шматгадовай, карпатлівай, грунтоўнай працы беларускіх краязнаўцаў, фотамастакоў, паліграфістаў, а кніжныя фаліянты – вечныя ахоўнікі нашай гісторыі, лёсу, памяці…

З урачыстымі прывітальнымі словамі выступілі міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карлюкевіч, першы намеснік старшыні Брэсцкага гарадскога выканаўчага камітэта Вадзім Краўчук і першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Ляўковіч.

*Вершы чытае Раіса Баравікова*



Асаблівае месца на выставе было адведзена «Берасцейскай Бібліі». Дырэктар па навуковай і выдавецкай рабоце Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аляксандр Суша прадставіў сваю новую навуковую манаграфію, прысвечаную фаліянту, – «Асэнсаванне шэдэўра».

Сярод важных энцыклапедычных выданняў былі адзначаны шматтомныя энцыклапедыі «Гарады і вёскі Беларусі», «Регионы Беларуси», у якіх адпаведныя тамы цалкам прысвечаны Брэсцкай вобласці. У спісе юбілейных выданняў вялікую цікавасць выклікае энцыклапедыя «Брэст. 1000», складальнікам якой з'яўляецца доктар гістарычных навук, загадчык кафедры Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна прафесар Аляксандр Вабішчэвіч.

У 2019 годзе духоўная скарбонка Брэстчыны папоўнілася двума змястоўнымі выданнямі: «Драўляныя сакральныя помнікі Берасцейшчыны: нарысы гісторыі, археалогіі і культуры» берасцейскага гісторыка і краязнаўцы Валерыя Мароза і «Кветкавы край Беларусі» паэта Леаніда Дранько-Майсюка, прысвечаны куточку радзімы аўтара – гораду Давыд-Гарадок. У выдавецтве «Беларусь» пабачылі свет кнігі «Беловежское диво» і «Царские охоты в Беловежской пуще. Страницы истории», адзін з аўтараў якіх – беларускі арнітолаг і навуковец Мікалай Чэркас – выступіў на імпрэзе.

Дырэктар кніжнай сеткі «Белкніга» Аляксандр Вашкевіч раскрыў галоўную інтрыгу дня, назваўшы тыя кнігі, якія найбольш ахвотна куплялі ў кнігарнях. Гэта выданні «Пінск. Палеская легенда» і «Брест. Мгновения спрессованы в столетья».

Міністр інфармацыі Алесь Карлюкевіч уручыў Ганаровыя граматы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь за значны ўклад у развіццё і папулярызацыю беларускай краязнаўчай літаратуры Валерыю Марозу, Анатолю Бензеруку, Анатолю Гладышчуку і Леаніду Несцярчуку, а яшчэ Падзяку – калектыву Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага і Ганаровую грамату за актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і распаўсюджванні энцыклапедычнага выдання «Брэст. 1000», прысвечанага тысячагоддзю горада Брэста, і за значны асабісты ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі – першаму намесніку старшыні Брэсцкага гарадскога выканаўчага камітэта Вадзіму Краўчуку.

Пяшчотныя і шчырыя паэтычныя радкі на адрас роднай Брэстчыны гучалі з вуснаў вядомых пісьменнікаў: Алеся Бадака, Леаніда Дранько-Майсюка, Раісы Баравіковай.

І, вядома ж, лілася мілагучная беларуская песня. Алесь Елісеенкаў выканаў аўтарскую песню на словы Алеся Бадака «Добрыя людзі», а калектыў «Грамніцы» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў – народныя песні, запісаныя ў вёсцы Лобча Лунінецкага раёна.

Загадчыца аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага Ірына Жэлянгоўская выступіла з відэапрэзентацыяй і расказала пра пісьменнікаў, якіх няма з намі, але яны пакінулі багатую літаратурную спадчыну. Успомнілі Уладзіміра Калесніка, Яўгенію Янішчыц, Ніну Мацяш, Алеся Каско, Міколу Купрэева…

У межах двухгадзіннай імпрэзы цяжка было ўзгадаць усе імёны і кнігі, прадстаўленыя на выставе. Але з года ў год узнікаюць новыя праекты, друкуюцца цікавыя выданні, праводзяцца сустрэчы з чытачамі, а гэта азначае, што падмурак духоўнага багацця ўмацоўваецца.



**Тацццяна ДЗЕМІДОВІЧ**

**Фота belkniga.by**